*Аляксандра Вадзімаўна Валодзіна*
Варшаўскі ўніверсітэт
дактарант
Варшава, Польшча
кандыдат гістарычных навук
a.v.valodzina@gmail.com

## СТРУКТУРА АБШЧЫНЫ ЕРЭТЫКОЎ-ВАЛЬДЭНСАЎ АД ПАЧАТКУ ІСНАВАННЯ ДА КАНЦА XIV СТАГОДДЗЯ

Першасны падзел вальдэнскага руху, які ўзнік на поўдні Францыі ў 70-ых гг. XII ст., адпавядаў пашыранай у тыя часы схеме падзелу ўсіх вандроўных ерэтычных рухаў апостальскай беднасці. Такая структура назіралася ва ўсіх рэгіёнах пашырэння вальдэнсаў ў абазначаны перыяд. Яшчэ пры жыцці свайго заснавальніка (Вальдо) секта падзялілася на вандроўных (бо «той, хто вандруе, бліжэй да Бога») магістраў/дасканалых (яшчэ сустракаюцца назвы «ўладар» (dominus), «спаведнік» (confessor), «прапаведнік» (predicator), «ерэсіярх» (heresiarchus) і інш.) і «вернікаў, якія маюць маёмасць і ўступаюць у шлюб, гандлююць, вядуць справы, набываюць і атрымліваюць прыбытак для сваіх ерэтыкоў-дасканалых, якія іх наведваюць, прапаведуюць і ратуюць, карыстаючыся даверлівасцю, якую ніжэйшыя да іх маюць». Падобнае чляненне ўсіх паслядоўнікаў руху на тых, хто вядзе свецкае жыццё, і на тых, хто духоўнае, назіраецца як у альбігойцаў, так і ў францысканцаў.

Розныя групы маюць розныя абавязкі: першыя «не працуюць, нічога не набываюць і не атрымліваюць прыбытку, на які маглі б выжываць, але на даброты і міласціну сваіх сяброў і вернікаў існуюць і жывуць, шчыра клапоцячыся пра навучанне». У інквізітарскіх матэрыялах XIII ст. удакладняецца: вернікі «часта наведваліся вальдэнсамі, слухалі іх пропаведзі, прымалі іх ці рабілі ім іншыя паслугі, і прымалі ад іх пацалунак міру». Звяртае ўвагу, што  для інквізітараў “вальдэнсы” – гэта толькі члены першай групы. А вальдэнскія «сябры» нагадваюць звычайную тэрцыярскую арганізацыю, колькасць якіх імкліва расце акурат у часы пантыфікату Інакенція III (1198-1216).

Праўда, цвёрдасць такіх «вернікаў» была слабая, бо падчас інквізіцыйных працэсаў яны часта раскайваліся, бо верылі, што «вальдэнсы – добрыя людзі і сябры Бога, і ў стане выратавацца, і гэтаму выратаванню вучаць іншых, калі хто хацеў далучыцца да іх, і ты прымала іх па той прычыне, што верыла, што яны – добрыя людзі». Калі ж высвятлялася, што гэтыя «добрыя людзі» адлучаныя ад царквы, – многія вернікі ад іх адварочваліся.

У крыніцах ёсць згадкі пра савет абшчыны, праўда, пра яго нічога канкрэтнага не гаворыцца, што не дазваляе выказаць якія-небудзь абгрунтаваныя меркаванні пра яго функцыі, склад, паўнамоцтвы і г. д. Таксама маюцца фрагментарныя звесткі пра новага главу руху, які заняў месца Вальдо пасля смерці апошняга ў пачатку XIII ст.

Асобным раздзелам мусіць быць разгледжана ўладкаванне вальдэнскай абшчыны ў мясцовасцях, дзе вернікі пражывалі стала, часам займаючы цэлыя вёскі. У такіх паселішчах сярод “вернікаў” мог вылучацца асобны кіраўнік, а дзе-нідзе і скарбнік. Паколькі гэтыя людзі вялі аселы лад жыцця, іх звычайна не адносілі да вандроўных “ерэсіярхаў”, іх статус можна вызначыць як “прамежкавы”. Але гэта пытанне на дадзены момант нераўнамерна даследавана для розных рэгіёнаў.

Дагэтуль прадметам спрэчак з’яўляецца і праблема іерархіі сярод вандроўных прапаведнікаў. Невядома, ці мелі вальдэнсы свой інстытут біскупства і дыяканату, бо згадкі пра іх няма ва ўласна вальдэнскіх крыніцах, толькі ў тых, што паходзяць ад інквізітараў. Гэта дае падставу некаторым даследчыкам казаць пра механічнае перанясенне на вальдэнсаў рэалій каталіцкай царквы.